View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 947.6(=411.6) «1914/1916»

# ЗАМЕЖНЫЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ПА ПЫТАННЯХ ГРАМАДСКА–ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**М.В. Цуба**
*Палескі дяржаўны ўніверсітэт*

Полесгу

Вывучэнне грамадска–палітычнага жыцця ў перыяд (жнівень 1914 – люты 1917 гг.) мае вялікае значэнне для разумення тых падзей і працэсаў, якія мелі месца на беларускіх землях. Аднак даследаванне гэтай праблемы не стала адным з прыярытэтных накірункаў ні ў савецкай, ні ў беларускай гістарычнай навуцы. Нягледзячы на тое, што за апошняе дзесяцігоддзе ўвага да аналізуемай тэматыкі значна ўзрасла: розныя аспекты абазначанага кола пытанняў знаходзілі адлюстраванне ў навуковай літаратуры. Усё ж патрэбна адзначыць, што па сённяшні дзень вельмі мала праводзіцца комплексных даследаванняў, якія б датычылася непасрэдна грамадска–палітычнага жыцця ў вызначаны перыяд.

Больш–менш аб'ектыўнай у вывучэнні дзейнасці розных грамадска–палітычных арганізацый на беларускіх землях з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914 – люты 1917 гг.) з'ўлялася літаратура, якая выходзіла за межамі Беларусі. Але цалкам пазбавіцца ад уплываў ідэалагічнай барацьбы ў сваіх падыходах няздольныя быліі аўтары гэтай плыні, антысавецкія пазіцыі якой былі адчувальныя ў тлумачэннях канкрэтных з'яў і падзей. Тым не менш, выдадзеныя тут асобныя працы, утрымлівалі каштоўную для далейшых даследаванняў гістарычную інфармацыю, адлюстроўвалі некаторыя новыя праблемы і канцэпцыі ў гісторыі беларускага нацыянальнага руху і грамадска–палітычнага жыцця ўвогуле. Напісаная з гэтых пазіцый, заслугоўвае ўвагі кніга вядомага беларускага каталіцкага дзеяча Адама Станкевіча "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" [1]. У дадзеным даследаванні разглядаецца ўзаемасувязь паміж беларускімі нацыял–дэмакратаміііншымі партыямі ў перыяд пасля расійскай рэвалюцыі 1905–1907гг., і ў гады першай сусветнай вайны. Падрабязна аналізуецца ўплыў Польскай партыі сацыялістычнай (ППС) на БСГ. Акрамя таго, у сваёй рабоце А.Станкевіч надае значную ўвагу высвятленню некаторых грамадска–палітычных змен на захопленых Германіяй тэрыторыях беларускіх губерняў, характарызуе працу беларускіх нацыянальных арганізацый іх кіраўнікоў пад нямецкай акупацыяй.

Праблемам беларускага нацыянальнага руху ў аналізуемы перыяд істотнае месца адводзіцца і ў працы Я.Найдзюка "Беларусь учора і сёньня", выдадзенай у 1940 годзе, якую дапоўніў і дапрацаваў у пасляваенны час І.Касяк [2]. У 40–я гады гэтая праца з'ўлялася амаль адзіным падручнікам для вывучэння гісторыі Беларусі ў эміграцкім асяроддзі. Асабліва насычаныя фактамі XXViXXVI раздзелы гэтай кнігі, дзе выкладаецца развіццё беларускага адраджэнскага руху напярэдадніі падчас першай сусветная вайны. Тут нагадваюцца імёны беларускіх дзеячаў, аналізуецца дзейнасць беларускіх грамадска–палітычных арганізацый з дакладнымі датаміі тэкстамі гістарычных дакументаў, што значна павышае каштоўнасць працы. Аднак даследаванне ў асноўным грунтуецца на ўжо вядомых фактах і якіх–небудзь новых звестак аб дзейнасці беларускага нацыянальнага руху тут няма.

Нават у самыя змрочныя часы сталінскіх рэпрэсій, мелі месца і стваральныя моманты. Шэраг навуковых прац выдадзеных у гэты перыяд расійскімі гісторыкамі, якія закранаюць у сваіх даследаваннях беларускія губерні, даволі падрабязна раскрываюць грамадска–палітычную дзейнасць бальшавікоў сярод сялянства і ў вайсковых фарміраваннях, а таксама аналізуюць рабочы і прафсаюзны рух у гады Першай сусветнай вайны (Крастынь Я. Революционная барьба крестьян в России в годы Империолистической войны 1914 – 1916 гг.) – М., 1932; Чаадаева О. Армия накануне Лютовской революции. – М. – Л., 1935; Романова Ф. Рабочее и прафсоюзное движение в годы Первой мировой войны и второй российской революции (1914 – февраль 1917 годы) – М., 1949). Улічваючы недасканаласць аўтарскай навукова – тэарэтычнай канцэпцыі і пэўную памылковасць меркаванняў, усё ж патрэбна прызнаць, што асвятленне вышэй адзначанымі аўтарамі асобных бакоў дзейнасці грамадска–палітычных сіл праводзілася з навуковых пазіцый, адпавядаючых свайму часу.

Розныя аспекты грамадска–палітычных пытанняў на беларускіх губернях знаходзілі пэўнае адлюстраванне ў расійскай навуковай літаратуры. Патрэбна адзначыць, што расійская гістарыяграфія шмат увагі ўдзяляючы бальшавіцкай партыі, як правіла, абыходзіла ў гэтым плане дзейнасць іншых грамадска–палітычных сіл на Беларусі ў перыяд далютаўскай рэвалюцыі. Лічачы ўсе існаваўшыя ў гэты час партыі, акрамя бальшавіцкай, апартуністычнымі і малапапулярнымі сярод народных мас, расійскія гісторыкі разглядалі ўдзел беларускага народа ў грамадска–палітычным жыцці свайго краю, як частку агульнарасійскага палітычнага працэсу, аналізуючы грамадска–палітычныя адносіны, у тым ліку і дзейнасць партый не па нацыянальнаму, а па сацыяльна–класаваму прызнаку. Такія погляды характэрны для прац Я.Бугаёва [3], Т. Бурмістравай і В. Гусаковай [4], С. Пушкарова [5], Ю. Данілава [6] і іншых. У апошні час праяўляецца вялікая цікавасць гісторыкаў да праблем развязвання Першай сусветнай вайны. Адной з прац, якая ўсебакова раскрывае дадзены аспект даследавання, з'ўляецца работа Б. Тупалева “Происхождение первой мировой войны” [7]. Новыя неардынарныя погляды і падыходы на грамадска–палітычныя і міжнародныя абставіны, якія мелі месца ў перыяд вайны прыводзяцца ў даследаванні У. Бруханава “Заговор графа Милорадовича” [8]. Аднак да гэтых публікацый расійскіх даследчыкаў патрэбна ставіцца ў значнай ступені крытычна, параўноўваючы прыведзеныя факты з іншымі крыніцамі і дакументальным матэрыялам.

Найбольшую цікавасць сярод прац польскіх гісторыкаў па нашай тэматыцы прадстаўляе навуковае выданне Ю. Туронка “Беларусь пад нямецкай акупацыяй” [9]. Значная ўвага ў гэтым даследаванні надаецца грамадска–палітычным падзеям, якія адбываліся падчас Першай і Другой сусветных войнаў. Прычым аўтар, не прэтэндуючы на асвятленне ўсіх аспектаў нямецкай акупацыйнай палітыкі на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны, перш за ўсё абапіраецца на дакументальныя матэрыялы і ўжо на іх падставе фармулюе асабістыя высновы.

Вялікае значэнне для разумення грамадска–палітычных працэсаў на беларускіх землях падчас вайны мае даследаванне польскага нацыянальнага пытання. Менавіта самым розным аспектам абазначанага кола праблем прысвечаны наступныя працы: FelchnerR. DzialalnoscPolskiegoKomitetuPomocySanitarnej (1914–1918). Rozprawa doktorska (maszynopis znajduje sie w Bibliotece Uniwersytetu Lodzkiego). Lodz, 1976.; Korzeniowski M. Rejon Zachodni Centralnego Komitetu Obywatelskiego – powstanie i początki dzialalnosci //Studia z dziejow Rosji i Europy Srodkowo–Wschodniej. T. XXIX. 1994.; Mądzik M. Z działalności Polskiego Towarzystwa Pomocy ofiarom Wojny na Białorusi // Zapiski Historyczne. T. L.XI 1996 z. 1.; Korzeniowski M. Na wygnanczym

szlaku… Działalośc Centralnego Komitetu Obywatelskiego Krolestwa polskiego na Białorusi w latach 1915–1918. Lublin, 2001.М.;Мондзік, М. Кажанёўскі. Польскіяграмадскіяратавальныяарганізацыі ў Беларусі ў часы І святавой вайны // Гістарычны альманах Т.8, Гародня. – 2003. – С. 76 – 97.

Грунтоўнай працай з вялікай колькасцю карыснай інфармацыі па розных аспектах грамадска–палітычных стасункаў і ўзаемаадносін паміж беларускім нацыянальным рухам і польскім у ваенны час з'яўляецца работа беларускага эмігранцкага гісторыка Юры Весялкоўскага "Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс)" [10].

Сабраны фактычны матэрыял па гэтай праблематыцы дапамог гісторыкам выдаць шэраг навуковых прац, якія тым ці іншым чынам разглядаюць развіццё яўрэйскага нацыянальнага руху, працу культурна–асветніцкіх, дабрачынных, рэлігійных, прадпрымальніцка–прафсаюзных арганізацый. Сярод прац замежных гісторыкаў па дадзенай тэматыцы найбольш карыснымі для нашага даследавання з'яўляюцца работы Я. Тамашэўскага [11], а таксама Л. Аўруцкага і М. Чарвяковай [12].

Такім чынам, зварот да даследаванняў замежных гісторыкаў, шмат у чым, дазволіў з новых пазіцый падыйсці да асвятлення шэрагу пытанняў грамадска–палітычнай праблематыкі часоў Першай сусветнай вайны. Але гэты перыяд па–ранейшаму застаецца найменш распрацаваным і высветленым, што дае падставы для працягвання дальнейшага пошуку невыяўленых крыніц, у тым ліку і за межамі Беларусі.

### ***Спіс выкарыстаных крыніц***

1. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення/А.Станкевіч. – Вільня: Шлях Моладзі, 1934. – 128 с.

2. Найдзюк , Я., Касяк, І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі/Я.Найдзюк, І.Касяк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 414 с.

3. Бугаев, Е. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии/ Е.Бугаев.–М.: Госполитиздат, 1975. – 270 с.

4. Бурмистрава, Т.Ю. Гусакова,В.С. Национальный вопрос в программах и тактике политических партий в России в 1905–1917гг./ Т.Ю.Бурмистрава, В.С. Гусакова. – М.: – 1976. – 117с.

5. Пушкарёв, С.Г. Обзор русской истории/С.Г. Пушкарёв. – Ставрополь: Кавказский край, 1993. – 416 с.

6. Данилов, Ю.Н. На пути к крушению/ Ю.Н. Данилов // Военно–исторический журнал. – 1991. – № 9. – С.75–82.

7. Туполев, Б.М. Происхождение первой мировой войны. Ч. 2/ Б.М. Туполев// Новая и новейшая история. – 2002. – № 5. – С.57– 98.

8. Брюханов,В.А. Заговор графа Милорадовича/ В.А.Брюханов. – М.: ООО «Издательство АСТ»: ООО «Издательство Астрель», ЗАО НПП «Ермак», 2004. – 415с.

9. Туронак,Ю.Беларусь пад нямецкай акупацыяй/ Ю.Туронак. – Мінск: Беларусь, 1993. – 236 с.

10. Весялкоўскі, Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс)/ Ю. Весялкоўскі. – Беласток – Лёндан, 1996 г. – 361 с.

11. Najnowsze dzieje zydow w Polsce w zaiysie (do 1950 roku). Pod red J. Tomaszewskiego. Warszawa, 1993. S. 116.

12. Овруцкий,Л., Червякова, М. Бунд – известный и неизвестный // Родина. – 1991. – № 9/10. – С. 64–68.

ПолесГУ